**Аляксей Мікалаевіч Дуброўскі (1945–2011), эколаг, краязнаўца, фатограф, журналіст**



Аляксей Мікалаевіч Дуброўскі нарадзіўся 2 студзеня 1945 г. у вёсцы Зачысце Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння сярэдняй школы паступіў на біялагічны факультэт Беларускаага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. На апошнім курсе ажаніўся з аднакурсніцай Верай Іосіфаўнай, якая стала верным сябрам і спадрожнікам. Працаваў навуковым супрацоўнікам у дзяржаўным запаведніку «Белавежская пушча», настаўнічаў у сельскай школе на Магілёўшчыне.

З 1970 г. – супрацоўнік Пінскага праектнага інстытута меліярацыі «Палессегіправадгас». Працаваў начальнікам вышукальнай партыі для вызначэння месцаў для меліярацыі пад саўгасы. У 1983 г. А. М. Дуброўскі прызначаны галоўным спецыялістам інстытута па ахове прыроды. З яго ўдзелам або па яго ініцыятыве было абследавана 62 тысячы га запаведнай тэрыторыі. Аляксей Мікалаевіч рэалізоўваў свае планы па вывучэнню і захаванню ўнікальнай прыроды Палесся. У інстытуце дзякуючы яму з’явіўся археалагічны музей. Вывучаў стварэнне біялагічнага заказніка «Спораўскі», гідралагічнага заказніка «Падвялікі Мох», заказнікаў «Ізін» і «Выдранка».

Эколага і краязнаўца хвалявала праблема захавання непаўторнай прыроды Палесся і клапаціў лёс багацейшай этнакультурнай спадчыны гэтага краю. З 1986 г. у розных часопісах і газетах былі апублікаваны сотні артыкулаў аб прыродзе, гісторыі і праблемах Палесся. У 2003 г. выйшла ў свет кніга Аляксея Дуброўскага «Палігон» – зборнік артыкулаў, напісаных за 25 гадоў.

У 1997 г. А. М. Дуброўскі прайшоў дзяржаўную атэстацыю ў Нацыянальным агенцтве па турызме і атрымаў пасведчанне экскурсавода. Дзякуючы Аляксею Мікалаевічу з’явіліся турыстычныя маршруты Пінск – Тураў, Пінск – Кудрычы. Распрацаваў некалькі варыянтаў экамаршрутаў па дзяржаўнаму ландшафтнаму заказніку рэспубліканскага значэння «Сярэдняя Прыпяць». Адкрыў для турыстаў архаічныя вёскі Кудрычы, Качановічы, Псышчава. Ім была створана экалагічная сцежка ў Кудрычах. З энтузіязмам вадзіў у паходы замежных вучоных-эколагаў, кандыдатаў і дактароў навук, звычайных школьнікаў і студэнтаў. Адным з першых экскурсаводаў стаў лаўрэатам конкурсу «Пазнай Беларусь» (2004).

А. М. Дуброўскі сабраў вялікую колькасць фота- і відэаматэрыялаў, ствараў аматарскія дакументальныя фільмы. Шмат падарожнічаў. Пераадольваў на веласіпедзе у дзень каля 100 км, начаваў у палатцы, абследаваў амаль усё Палессе, а таксама ездзіў па Расіі, Украіне, Польшчы, дабіраўся да Адэсы, Мальбарка, Кракава. У 2001 г. адбылася яго першая фотавыстава «Ляснымі сцежкамі Палесся». Фотаработы дэманстраваліся ў Пінску, Драгічыне, Кобрыне, Бярозе і іншых гарадах. Апошняя прыжыццёвая

персанальная фотавыстава «Родная зямля» адбылася ў кастрычніку 2009 г. у Музеі Беларускага Палесся.

З 2004 г. працаваў фотакарэспандэнтам газеты «Живая вода» і супрацоўнічаў з іншымі беларускімі і польскімі выданнямі. У 2005 г. выйшаў у свет яго аўтарскі фотаальбом «Край пад белымі крыламі» пра Беларускае і Украінскае Палессе. Пераможца творчага конкурсу на лепшае асвятленне тэм сацыяльнага жыцця, краязнаўства і экалогіі Палескага краю, аб’яўленага Беларускай асацыяцый журналістаў (2006).

Аляксей Мікалаевіч займаў актыўную грамадскую пазіцыю. У 1990–1999 гг. з’яўляўся дэпутатам Пінскага гарадскога Савета дэпутатаў. Вельмі шмат зрабіў для Пінска. Менавіта ён даў назву Верасы аднаму з мікрараёнаў горада. Па яго праекце быў практычна адноўлены дрэнаж падмурка палаца Бутрымовіча, што дазволіла выратаваць архітэктурную каштоўнасць.

А. М. Дуброўскі памёр 27 снежня 2011 г. У студзені 2013 г. у Музеі Беларускага Палесся адкрылася выстава, прысвечаная памяці палескага эколага, краязнаўца і фотамастака. У студзені 2014 г. у Пінску прайшла прэзентацыя кнігі А. М. Дуброўскага «Лекарственныве свойства Полесской флоры», якая выдадзена на аснове пакінутай ім спадчыны. У Пінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Янішчыц 9 студзеня 2020 г. адбыўся вечар памяці Аляксея Мікалаевіча «Дарогай святла».

**Працы А. М. Дуброўскага**


1. **Лекарственные свойства полесской флоры** / Алексей Дубровский. – Пинск : КУП «Пинская региональная типография», 2013. – 128 с.
2. **Край пад белымі крыламі** : фотаальбом / тэкст А. М. Дуброўскі. – Пінск : Паляшук, 2006. – 164 с.
3. **Палігон** : палескі дзённік / Аляксей Дуброўскі. – Мінск : Арты Фэкс, 2004. – 340 с.
4. **Пинский район** : справочник туриста / [текст Т. А. Хвагиной ; фото: С. М. Плыткевич, Е. В. Таламай, А. Н. Дубровский]. – Минск : Рифтур Принт, 2006. – 72, [2] с. – (Жемчужина Полесья).
5. **Из опыта работы с иностранными экотуристами в Белорусском Полесье** / А. Н. Дубровский // Беларусь в современном мире : материалы V Междунар. науч. конф., посвящ. 85-летию образования Бел. гос. ун-та, Минск, 3 нояб. 2006 г. Минск, 2007. С. 204–206.
6. **Кому на болоте жить хорошо?** / А. Дубровский // Родная прырода. 2010. № 10. С. 20–21.
7. **Полесье привлекает любителей путешествий** : [о посещении иностранными туристами Полесья в конце 1980-х – начале 1990-х гг.] / А. Дубровскій // Полесская правда. Пінск, 2010. 9 января. С. 8.
8. **По «соломенной» дороге** : [о ландшафтном заказнике «Средняя Припять»] / А. Дубровскій // Полесская правда. Пинск, 2009. 3 июня. С. 3.

9. **Полесье глазами иностранных туристов** : [впечатления журналиста, писателя Терезы Седляр Колышко от посещения Полесья] / пер. с польск. А. Дубровский // Мясцовы час. Пинск, 2007. 4 студзеня. С. 4.
10. **Свидетели нашей древней истории** : [Столинские камни] / А. Дубровскій // Мясцовы час. Пінск, 2006. 23 лістапада. С. 7.
11. **Эйфория туризма и Огинский канал** / А. Дубровский // Мясцовы час. Пінск, 2005. 13 студзеня. С. 6.
12. **Старинный промысел** : [о развитии бортничества на Полесье] / А. Дубровский // Полесская правда. Пинск, 2003. 14 июня. С. 3.

### Аб жыцці і дзейнасці А. М. Дуброўскага

1. **Дабравольская, А.** «Я вярнуся сюды, дзе туманы і росы...» : [да 75-годдзя з дня нараджэння А. М. Дуброўскага] / Алена Дабравольская ; фота Уладзіміра Меляшэнкі // Пінскі веснік. 2020. 17 студзеня. С. 4.
2. **Хвагина, Т.** Человек, влюбленный в Полесье... : [к 75-летию со дня рождения А. Н. Дубровского] / Татьяна Хвагина // Полесская правда. Пинск, 2020. 4 января. С. 12.
3. **Шчарбакова, Т.** Дарунак земляка : [у канцэртнай зале размешчана фотавыстава А. Дуброўскага] / Тамара Шчарбакова // Пінскі веснік. 2017. 14 лістапада. С. 8.
4. **Урбанович, И.** Жизнь посвятил Полесью : [в Пинской районной библиотеке состоялся вечер-воспоминание, посвящённый 70-летию со дня рождения эколога и краеведа А. Н. Дубровского] / Инна Урбанович // Полесская правда. Пинск, 2015. 14 января. С. 3.
5. **Куницкий, П.** Он – Дубровский : [в Пинске решено учредить конкурс имени эколога и краеведа Алексея Дубровского] / Павел Куницкий // Вечерний Брест. 2015. 7–9 января. С. 11.
6. **Наследие краеведа** : [о презентации книги А. Дубровского «Лекарственные свойства полесской флоры»] // Полесская правда. Пинск, 2014. 1 февраля.
7. **Куницкий, П.** В Пинске вспоминали краеведа / Павел Куницкий // Живая вода. 2013. 19 января.
8. **Чалавек з вялікай любоўю да Радзімы ў сэрцы** : [пра краязнаўча-літаратурны конкурс памяці А. Дуброўскага] // Варяг-пресс. Пинск, 2012. 25 мая (№ 21). С. 2.
9. **Наварич, В.** «Я вернусь туда, где туманы и росы...» / Валентина Наварич // Живая вода. 2012. 4 февраля.
10. **Качановский, Н.** Памяти друга / Николай Качановский // Пінскі веснік. 2012. 3 лютага.
11. **Скорбим :** [сообщение о смерти Дубровского Алексея Николаевича] // Пінскі веснік. 2012. 3 студзеня. С. 3.
12. **Андреева, М.** Удивительное – рядом / Маргарита Андреева // Полесская правда. Пинск, 2006. 20 декабря.

13. **Jaroszewicz, A.** «Kraj pod bialymi skrzydlami» : [о презентации фотоальбома Алексея Дубровского о Полесье] / A. Jaroszewicz // Goniec Bialski. 2006. № 9. S. 32.
14. **Сабіна, П.** Дуброўскі: знаўца палескіх таямніц : [пра пінскага краязнаўца, эколага А. М. Дуброўскага] / Пятро Сабіна // Беларуская думка. 2006. № 4. С. 170–177 : фат.
15. **Демид, И.** Вклад Дубровского оценили в Варшаве / Инна Демид // Полесская правда. Пинск, 2005. 12 февраля. С. 8.
16. **Дубровский, А.** Старость меня дома не застанет / Алексей Дубровский ; [беседовал] Виктор Ярошук // Мясцовы час. 2003. 20 лістапада. С. 6.
17. **Шапиро, С.** «Полигон» : [о книге А. Дубровского, презентация которой состоялась в центральной городской библиотеке] / Семен Шапиро. Лукашик, Т. Любовь и боль его Полесье / Татьяна Лукашик // Пинская неделя. 2002. 22 ноября.